Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842
Выходзіць штомесяц са студзеня 2006 г.

# ГІСТОРЫЯ
## праблемы выкладання

"У дапамогу педагогу"
Серыя

№ 9 (51) ’ 2006

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**М. І. МІНІЦКІ — галоўны рэдактар,** *кандыдат гістарычных навук*

**У. В. ТУГАЙ — першы намеснік галоўнага рэдактара,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар**
**І. І. БАГДАНОВІЧ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. В. ПАНОЎ,** *кандыдат педагагічных навук*
**С. М. ХОДЗІН,** *кандыдат гістарычных навук*
**В. М. ШУТАВА,** *кандыдат гістарычных навук*
**Л. У. ЖЭРКА**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА**

**У. В. ТУГАЙ — старшыня**
**М. М. ЗАБАЎСКІ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**А. А. КАВАЛЕНЯ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. А. КАПРАНАВА,** *доктар педагагічных навук*
**І. В. КАРПЕНКА**
**Г. А. КОСМАЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**У. С. КОШАЛЕЎ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**М. С. СТАШКЕВІЧ,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**В. М. ФАМІН,** *доктар гістарычных навук, прафесар*
**І. І. ЦЫРКУН,** *доктар педагагічных навук, прафесар*



**Заснавальнік і выдавец —**
**Установа «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”»**
**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

г. Мінск, вул. Караля, 16; тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу), факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by, http:/www.aiv.by

# УЗВАЖАНЫ ПАДЫХОД ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ*

Выхад у свет чарговага, пятага, тома шасцітомнай «Гісторыі Беларусі», які ахоплівае 1917–1945 гг., з'явіўся важнай падзеяй у сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Асабліва каштоўным з'яўляецца тое, што ў ім побач з пашырэннем выкарыстання гістарычных дакументальных крыніц значная ўвага надаецца абгрунтаванасці зробленых высноў і абагульненняў, удакладненню пралікаў і недакладнасцей, якія мелі месца пры распрацоўцы айчыннай гісторыі ў першыя гады існавання суверэннай Рэспублікі Беларусь. Гэта тычыцца як «Нарысаў гісторыі Беларусі»: у 2 ч. Ч. 2. — Мінск : Беларусь (1995), так і іншых прац, што выйшлі ў 90-я гг. XX ст.

Падрыхтоўка пятага тома прыпадае на час, які характарызуецца адноснай стабільнасцю і паступальнасцю поспехаў пасля перыяду эканамічнага спаду ў жыцці беларускага народа, характэрных для першай паловы 90-х гг. мінулага стагоддзя. У дадзеных умовах галоўнай для беларускіх гісторыкаў была распрацоўка канцэпцыі нацыянальнай гісторыі Беларусі.

У гэтым акадэмічным выданні ёсць шмат новага, аўтарскія падыходы па ўсіх разглядаемых пытаннях вытрыманыя, непрадузятыя. Перад асноўнай часткай змешчаны раздзелы аб гістарыяграфіі і крыніцах. У іх прыводзяцца найбольш значныя выданні як абагульняючага, так і праблемнага характару, раскрываюцца шляхі да важных крыніц, якія існуюць і даступны даследчыкам сёння. Такая інфармацыя падае чытачу надзею на атрыманне нечага новага ў асноўнай частцы. Але ў гэтай інфармацыі, на жаль, мы не знаходзім нават упамінання твораў па тэорыі і метадалогіі гісторыі, створаных у беларускай гістарыяграфіі. Між тым яны маглі б арыентаваць чытача як на выкарыстанне, так і на паглыбленне канцэптуальнага падыходу, традыцыйных і інавацыйных метадаў даследавання для развіцця гістарычнай навукі, паслядоўнага выканання ёю сваіх сацыяльных функцый, павышэння ўласнага прэстыжу.

Прагрэс навукі бачны не толькі ў адкрыцці новых матэрыялаў, але і ў новым прачытанні ўжо вядомага матэрыялу. Між тым у рэспубліцы даўно склаліся і развіваюцца свае крыніцазнаўчая і метадалагічная школы. Здабыткі іх дзейнасці, па сутнасці, з'яўляюцца неад'емнай часткай гістарыяграфіі і крыніцазнаўства, гісторыі гістарычнай думкі.

На наш погляд, не мае падстаў ігнараванне розных напрамкаў у гістарыяграфіі, у тым ліку сацыяльна-псіхалагічнай і квантытатыўнай, жаночай і гендэрнай, у якіх накапіліся значныя пласты літаратуры. Гэта ж тычыцца і навучальнай гістарычнай літаратуры. У наш час, калі востра паўстала праблема развіцця гістарычнага мыслення моладзі і некаторай часткі навукоўцаў, вучэбная літаратура не можа абмяжоўвацца тым, што ўжо ўсталявалася ў навуцы, асабліва ў пераходны перыяд. Яна павінна насіць сучасны навуковы характар як па падачы матэрыялу, так і па яго змесце; вучыць на аснове метадалогіі даследавання гісторыі і ўлічваць сучасныя патрабаванні педагогікі і методыкі выкладання.

Звяртае на сябе ўвагу выверанасць назваў раздзелаў і параграфаў. Яны сведчаць аб тым, што, *па-першае*, у томе выдзелены новыя сюжэты, *па-другое*, матэрыял падаецца ў сацыякультурным вымярэнні, *па-трэцяе*, назвы больш строга адпавядаюць таму матэрыялу, які яны ўяўляюць. Толькі адно пералічэнне назваў розных пунктаў павявае свежымі навінамі, выклікае жаданне прачытаць і пераканацца ў адкрыцці аўтарамі гэтай фундаментальнай працы новых старонак гісторыі Беларусі савецкага часу.

У адзначаных раздзелах прыцягваюць увагу новыя ацэнкі і матэрыялы. Кастрычніцкая рэвалюцыя разглядаецца як «невядомая» стадыя ў эвалюцыі рэвалюцыйнага працэсу, калі бальшавіцкая партыя на чале з У. І. Леніным умела выкарыстала ўзнікшыя абставіны (умовы Першай сусветнай вайны, няўмеласць буржуазіі, абвастрэнне сацыяльна-палітычных супярэчнасцей) для захопу ўлады. Краіна прайшла недастатковы шлях буржуазнай дэмакратыі, што ўскладніла яе далейшае развіццё. З гэтым тэзісам аўтараў нельга не пагадзіцца. Бальшавікоў абвінавачваюць у ломцы шматлікіх матэрыяльных і

---

* Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: А. Вабішчэвіч [і інш.]. — Мінск : Экаперспектыва. — Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — 2006. — 613 с.

духоўных асноў культуры, ігнараванні ў значнай ступені нацыянальнага пытання беларусаў, падпарадкаванні НКУС і культу асобы фактычна ўсіх бакоў жыцця краіны. Працэс аднаўлення Савецкай Беларусі на аснове нэпа быў цяжкім, але выніковым па ўсіх напрамках, пакуль яго не зламала таталітарнае праўленне, устаноўленае бальшавікамі.

Станоўча ўспрымаюцца высновы аб тым, што ўзнікненне БССР было значным крокам наперад у параўнанні з Паўночна-Заходнім краем, якім была Беларусь у складзе Расійскай імперыі; што савецкая ўлада ўсё больш рабілася бальшавіцкай; што, нягледзячы на невысокую ступень сацыяльнага размежавання грамадства ў Беларусі, яна ва ўмовах тагачаснага геапалітычнага становішча зведала цяжкія выпрабаванні, аж да падзелу на дзве часткі, якія працягваўся амаль два дзесяцігоддзі. Жыццё ў Савецкай Беларусі вызначалася самаадданай працай народа, пранізлівай агітацыяй і прапагандай, падазронасцю і страхам. У гэты ж час у Заходняй Беларусі адбывалася паланізацыя і пашыралася барацьба за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне. Пераадоленне гістарычнай несправядлівасці ў адносінах да беларускага народа адбылося ў незвычайных і складаных абставінах пачатку Другой сусветнай вайны. Трагічным працягам нашай гісторыі стала Вялікая Айчынная вайна, удзел у якой беларускага народа вызначаўся гераізмам і самаахвярнасцю.

У навуковы зварот уведзены новы фактычны матэрыял, пры гэтым ён падпарадкоўваецца дасягненню пастаўленай мэты і часам падаецца на расійскім факталагічным фоне. Асаблівую цікавасць выклікае, напрыклад, інфармацыя аб дзейнасці сялянскіх аб'яднанняў, у прыватнасці Беларускай сялянскай партыі «Зялёны дуб» (1919–1926), і барацьбе супраць іх савецкай улады. Зялёнадубцы лічылі савецкую ўладу выпадковай і варожай, сябе — «выразнымі ворагамі польскасці», выступалі за малую грамадзянскую вайну.

Калі гаварыць аб недахопах выдання, то можна параіць аўтарам наступнае.

1. Зварот да паўсядзённасці патрабуе не толькі канстатацыі наяўнасці простых людзей з іх звычайнымі справамі. Але такімі былі і кіраўнікі, наркамы і генералы. Гісторыя паўсядзённасці галоўным чынам патрабуе адлюстравання таго, як успрымалася кожным чалавекам, незалежна ад яго становішча ў грамадстве, рэчаіснасць, як ён падпарадкоўваў сваю разліковую дзейнасць лініі кіруючай партыі. Гэтага, на жаль, у працы не хапае.

2. Не атрымала адлюстравання ў кнізе такая актуальная тэма, як гістарычнае ўсведамленне сябе беларусамі, асабліва ва ўмовах памежжа культур, характэрнага для іх. Цяпер яго прынята лічыць больш шырока — як усведамленне сябе ў часе і ў прасторы. У гэтым сэнсе адлюстраванне нацыянальнага руху і нацыянальна-культурнага адраджэння прымае больш важнае значэнне. Тым самым шмат у чым здымаецца палітызаваны падыход да нацыянальнага пытання ў час Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны.

3. Можна лічыць, што шматтомная гісторыя Беларусі зроблена ў рамках канцэпцыі мадэрнізацыі, прычым мадэрнізацыі зверху — з боку дзяржавы, уласцівай для першай паловы XX ст. Між тым сучаснае развіццё рэспублікі сведчыць аб тым, што адбываецца не лінейная, а цыклічная эвалюцыя рэспублікі. Кіруючыся гэтай акалічнасцю (гісторык павінен ісці наперадзе, у адпаведнасці з павевамі часу), XX — пачатак XXI ст. трэба апісваць, на наш погляд, і з гэтай пазіцыі. Такі падыход дазваляе больш грунтоўна разабрацца ў сучасным развіцці краіны.

Адзначаныя заўвагі трэба разумець як пажаданне сучасным і будучым аўтарам абагульняючых прац. Але і на гэтым узроўні выхад у свет пятага тома нацыянальнай гісторыі — з'ява, якая сведчыць аб значных поспехах супрацоўнікаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі, аб тым, што беларуская гістарыяграфія папоўнілася новай змястоўнай працай.

**У. Сідарцоў,**
**В. Фамін**


Рэдактар Л. В. Саламаха, карэктар А. У. Бельская,
камп'ютэрны набор А. П. Шаціла, вёрстка В. Ю. Зарэцкая.

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 14.09.2006. Фармат $60 \times 84\ ^1/_8$.
Друк афсетны. Папера афсетная. Ум. друк. арк. 7,44. Ул.-выд. арк. 7,5.
Тыраж 1778 экз. Заказ № 126. Цана свабодная.

Паштовы адрас рэдакцыі часопіса «Гісторыя: праблемы выкладання»:
220070, г. Мінск, вул. Будзённага, 21, пакой 6; тэл. 297-93-20.

Надрукавана ў друкарні
Установы «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"».
ЛП № 02330/0131527 ад 28.07.2005.
220088, г. Мінск, вул. Захарава, 59.